**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ СУПРАЦЬДЗЕЯННІ ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНЫМ РЭПРЭСІЯМ І АБАРОНЕ БЕЛАРУСАЎ ЗА МЯЖОЙ

8–9 жніўня, Варшава

**Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сіл Беларусі**,

кіруючыся Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародным пактам аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Канвенцыяй супраць катаванняў і Канвенцыяй аб статусе ўцекачоў;

прымаючы да ўвагі, што пасля 2020 года транснацыянальныя рэпрэсіі рэжыму Лукашэнкі супраць людзей і арганізацый за межамі Беларусі набылі ўстойлівы і сістэмны характар;

разумеючы пад транснацыянальнымі рэпрэсіямі дзеянні органаў і службовых асоб рэжыму Лукашэнкі, а таксама асоб і структур, якія дзейнічаюць па іх даручэнні, пры іх садзейнічанні, пад іх кантролем або ў каардынацыі з імі, якія здзяйсняюцца за межамі Беларусі або здзяйсняюцца ў Беларусі, але скіраваныя на ўздзеянне на людзей і арганізацыі за мяжой з мэтай іх запалохвання, пакарання, прымусу, ізаляцыі, перашкаджання законнай дзейнасці або прымусовага вяртання людзей у Беларусь;

канстатуючы, што задакументаваныя выпадкі і практыкі ўключаюць прамое сілавое ўздзеянне, завочны крымінальны пераслед і завочныя прысуды, выкарыстанне экстрадыцыйных і міжнародных вышуковых механізмаў у палітычна матываваных мэтах, пашпартныя і консульскія абмежаванні, ціск на сваякоў і маёмасны ціск, лічбавы пераслед, выкарыстанне схаванага назірання, збору інфармацыі і спроб вярбоўкі для запалохвання, шантажу або прымусу, а таксама прымусовую высылку вызваленых палітвязняў за межы Беларусі без іх свабоднай і інфармаванай згоды;

адзначаючы, што рэпрэсіўныя меры, якія прымяняюцца на тэрыторыі Беларусі, уключаючыператрусы і допыты сваякоў, крымінальны пераслед, маёмасны ціск і стварэнне перашкод у атрыманні або выкарыстанні дакументаў, выкарыстоўваюцца для ўздзеяння на беларусаў і беларускія арганізацыі за мяжой;

выказваючы асаблівую занепакоенасць тым, што законнае навучанне, выкладанне і аплата адукацыйных паслуг за мяжой выкарыстоўваюцца ў якасці падставы для ціску, у прыватнасці ў выпадку Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, што павышае ўразлівасць студэнтаў, выпускнікоў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, іх сваякоў і асоб, якія аплачваюць навучанне;

прызнаючы асаблівую ўразлівасць палітыкаў, грамадскіх актывістаў, журналістаў, праваабаронцаў, валанцёраў, студэнтаў і выкладчыкаў, арганізатараў дыяспаральных супольнасцяў, вызваленых і прымусова высланых палітвязняў, іх сваякоў, а таксама беларусаў за мяжой, якія не ўдзельнічаюць у публічнай дзейнасці;

падкрэсліваючы, што сістэмы Інтэрпола, экстрадыцыі, міграцыі і міжнароднага прававога супрацоўніцтва не павінны выкарыстоўвацца для палітычна матываванага пераследу;

адзначаючы, што пэўныя дзеянні транснацыянальных рэпрэсій, якія ажыццяўляюцца прадстаўнікамі рэжыму Лукашэнкі, складаюць асобныя элементы злачынстваў супраць чалавечнасці, учыненыя ў трансгранічным кантэксце;

вітаючы рашэнне Офіса Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда распачаць расследаванне сітуацыі, перададзенай Урадам Літоўскай Рэспублікі, якое ахоплівае такія злачынствы супраць чалавечнасці, як дэпартацыя і пераслед шляхам дэпартацыі любой ідэнтыфікаванай групы або супольнасці па палітычных матывах, меркавана ўчыненыя беларускімі ўладамі трансгранічна;

**прымаем гэтую рэзалюцыю:**

1. Рашуча асуджаем транснацыянальныя рэпрэсіі рэжыму Лукашэнкі як працяг палітычнага пераследу за межамі Беларусі і як пагрозу бяспецы грамадзянаў Беларусі і дзяржаў, якія іх прымаюць.
2. Канстатуем, што гэтыя практыкі пагражаюць праву на свабоду і асабістую бяспеку, ствараюць рызыку адвольнага пазбаўлення волі, катаванняў і жорсткага абыходжання пры вяртанні ў Беларусь, абмяжоўваюць свабоду перамяшчэння, уключаючы магчымасць пакідаць краіну і вяртацца ў яе, а таксама права на адукацыю і акадэмічную свабоду, права на прыватнае і сямейнае жыццё, свабоду выказвання меркаванняў і свабоду аб’яднанняў, а таксама доступ да працы, аховы здароўя і сацыяльнай абароны.
3. Падкрэсліваем, што законнае навучанне, законная праца і законныя ахвяраванні, грамадская і палітычная дзейнасць за мяжой, а таксама сваяцкія сувязі не павінны служыць падставай для пераследу, абмежавання правоў або іншых формаў ціску.
4. Выказваем салідарнасць з усімі пацярпелымі ад транснацыянальных рэпрэсій, а таксама з арганізацыямі, універсітэтамі, праваабаронцамі, адвакатамі і супольнасцямі, якія прымаюць пацярпелых, усімі, хто забяспечвае ім абарону і падтрымку.
5. Разглядаем расследаванне Офіса Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда, якое ахоплівае меркаваныя злачынствы супраць чалавечнасці, здзейсненыя прадстаўнікамі рэжыму Лукашэнкі, як ключавы міжнародны механізм прыцягнення да адказнасці за транснацыянальныя рэпрэсіі.

**ПАТРАБУЕМ АД РЭЖЫМУ ЛУКАШЭНКІ**

- неадкладна спыніць усе формы транснацыянальных рэпрэсій супраць людзей і арганізацый за межамі Беларусі, уключаючы пагрозы, пераслед, прымус і іншыя формы ціску, а таксама выкарыстанне схаванага назірання, збору інфармацыі і спроб вярбоўкі для запалохвання, шантажу, прымусу або пераследу;
- спыніць завочны крымінальны пераслед па палітычных матывах, адклікаць палітычна матываваныя экстрадыцыйныя запыты і запыты аб міжнародным вышуку, а таксама скасаваць рашэнні, прынятыя па такіх справах;
- спыніць ціск на сваякоў, маёмасны ціск і пераслед за навучанне, выкладанне, працу, ахвяраванні, атрыманне дапамогі і ўдзел у грамадскіх мерапрыемствах за межамі Беларусі, якія ажыццяўляюцца на законных падставах; скасаваць рашэнні і практыкі, якія крыміналізуюць такую дзейнасць;
- аднавіць паўнавартаснае консульскае абслугоўванне, спыніць выняцце пашпартоў і прызнанне іх несапраўднымі па палітычных матывах, а таксама іншыя практыкі, якія пакідаюць людзей без дзейсных дакументаў або вымушаюць іх вяртацца ў Беларусь ва ўмовах, якія пагражаюць іх бяспецы;
- спыніць прымусовую высылку палітвязняў пасля вызвалення; вызваленне не павінна ставіцца ў залежнасць ад згоды пакінуць Беларусь, а вызваленым неабходна забяспечыць рэальны выбар месца жыхарства, доступ да адваката, дакументаў, медыцынскай дапамогі і сувязі з сям’ёй.

**ЗАКЛІКАЕМ ДЗЯРЖАВЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ**

- забяспечваць эфектыўную абарону беларусаў на сваёй тэрыторыі ад транснацыянальных рэпрэсій і не дапускаць, каб дзеянні рэжыму Лукашэнкі прыводзілі да дадатковага абмежавання іх правоў, прававога статусу або ўдзелу ў грамадскім і палітычным жыцці;
- не дапускаць выдачы, дэпартацыі або іншага вяртання ў Беларусь з-за рызыкі прымянення катаванняў, жорсткага абыходжання або палітычна матываванага пераследу і праводзіць індывідуальную ацэнку ўсіх істотных абставін, уключаючы наяўнасць завочных крымінальных спраў і палітычна матываваных рашэнняў, публічную і прафесійную дзейнасць, навучанне або працу ў арганізацыях, якія пераследуюцца рэжымам, ахвяраванні і рызыкі для сваякоў у Беларусі;
- старанна правяраць запыты рэжыму Лукашэнкі ў рамках механізмаў Інтэрпола, экстрадыцыі, міжнароднай прававой дапамогі і міграцыйных працэдур і не разглядаць рашэнні яго органаў як дастатковы доказ таго, што абвінавачанне не мае палітычнага характару, або абгрунтаванасці крымінальнага пераследу;
- выдаваць альтэрнатыўныя дакументы, забяспечваць устойлівы прававы статус і доступ да базавых паслуг людзям, якія не могуць бяспечна звяртацца ў консульскія ўстановы Беларусі або вяртацца ў Беларусь; забяспечваць прымусова высланым асобам доступ да часовага жылля, медыцынскай і псіхасацыяльнай дапамогі, рынку працы і працэдур уз’яднання сям’і;
- падтрымліваць бесперапыннасць адукацыі, бяспечны выезд, атрыманне віз, а таксама аказваць юрыдычную і псіхалагічную дапамогу студэнтам, выпускнікам,

выкладчыкам і супрацоўнікам, якія зазналі ціск у сувязі з навучаннем або працай у замежных адукацыйных установах;

- аператыўна правяраць і, пры наяўнасці падстаў, расследаваць паведамленні пра пагрозы, незаконнае назіранне, спробы прымусовай вярбоўкі, шантаж, правакацыі і гвалт у дачыненні да грамадзянаў Беларусі, беларускіх супольнасцяў і арганізацый; ствараць зразумелыя і бяспечныя каналы для паведамлення аб такіх выпадках;
- прымяняць пратаколы па зніжэнні рызык для сваякоў, якія застаюцца ў Беларусі, і не раскрываць сенсітыўныя даныя без інфармаванай згоды пацярпелых і папярэдняй ацэнкі магчымых наступстваў;
- падтрымліваць расследаванне Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда па сітуацыі, перададзенай Літоўскай Рэспублікай, у тым ліку шляхам перадачы Суду адпаведнай інфармацыі і доказаў, забеспячэння бяспечнага ўдзелу пацярпелых і сведак, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, а дзяржавам — удзельніцам Рымскага статута — таксама разгледзець магчымасць перадачы ў адпаведнасці з яго артыкулам 14 інфармацыі аб звязаных з гэтай сітуацыяй меркаваных злачынствах, учыненых на іх тэрыторыі або іншым чынам падпадаючых пад юрысдыкцыю Суда.

## ЗАКЛІКАЕМ ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ, РАДУ ЕЎРОПЫ, ААН І ІНШЫХ МІЖНАРОДНЫХ ПАРТНЁРАЎ

- узгадніць устойлівыя працэдуры міждзяржаўнага абмену інфармацыяй і рэагавання на транснацыянальныя рэпрэсіі, уключаючы рызыкі, звязаныя з дакументамі, консульскім абслугоўваннем, адукацыяй, экстрадыцыяй і лічбавай бяспекай;
- падтрымліваць сумяшчальныя і абароненыя сістэмы дакументавання, а таксама абмен абязлічанай інфармацыяй пры захаванні прынцыпаў мінімізацыі даных, размежавання доступу, інфармаванай згоды і папярэдняй ацэнкі рызыкі для пацярпелых і іх сваякоў;
- прымяняць мэтавыя абмежавальныя меры да асоб і структур, датычнасць якіх устаноўлена кампетэнтнымі органамі або пацвярджаецца сукупнасцю дакладных звестак, якія паддаюцца праверцы, а таксама садзейнічаць рэалізацыі нацыянальных і міжнародных механізмаў прыцягнення да адказнасці ў межах іх мандатаў;
- падтрымліваць незалежныя беларускія медыя, праваабарончыя арганізацыі, фонды дапамогі, універсітэты і ініцыятывы дыяспары, якія выяўляюць выпадкі транснацыянальных рэпрэсій, кансультуюць пацярпелых і забяспечваюць практычную абарону;
- аказаць палітычную, экспертную і фінансавую падтрымку расследаванню Міжнароднага крымінальнага суда па сітуацыі, перададзенай Літоўскай Рэспублікай, і садзейнічаць супрацоўніцтву дзяржаў з Судом.

## ДАРУЧАЕМ ІНСТЫТУТАМ БЕЛАРУСКІХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ

- на працягу шасці месяцаў вызначыць упаўнаважаны каардынацыйны орган па супрацьдзеянні транснацыянальным рэпрэсіям з удзелам праваабарончых, дыяспаральных, адукацыйных і экспертных арганізацый;

- распрацаваць адзіны бяспечны пратакол прыёму паведамленняў, дакументавання выпадкаў, перанакіравання па юрыдычную дапамогу, дапамогу ў атрыманні і афармленні дакументаў, медыцынскую і псіхалагічную дапамогу, а таксама інфармавання дзяржаў, якія прымаюць беларусаў; прадугледзець мінімізацыю збіраемых даных, размежаванне доступу і магчымасць абязлічанага звароту;
- уключаць абарону ад прымусовай высылкі, рэальны выбар месца жыхарства, доступ да дакументаў і адваката, а таксама магчымасць падтрымліваць сувязь з сям’ёй ва ўсе перамовы і дамоўленасці аб вызваленні палітвязняў;
- штогод ацэньваць выкананне гэтай рэзалюцыі і не пазней чым да пачатку чарговай Канферэнцыі публічна прадстаўляць абязлічаны агляд выяўленых формаў транснацыянальных рэпрэсій, прынятых мер абароны і нявырашаных праблем у забеспячэнні бяспекі і правоў пацярпелых.

**Палітычна матываваны пераслед беларусаў не павінен працягвацца ні ўнутры, ні за межамі краіны або заставацца без адказу. Абарона пацярпелых, прадухіленне новых выпадкаў і прыцягненне датычных асоб да адказнасці з’яўляюцца неад’емнай часткай абароны правоў чалавека і пабудовы свабоднай, дэмакратычнай і прававой Беларусі.**

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*